# Мае сустрэчы з тав. Леніным

*А. Ф. Мяснікоў*

Упершыню тав. Леніна я ўбачыў у студзені 1918 года на першым і апошнім пасяджэнні Устаноўчага сходу. Наша фракцыя ў перапынку даволі-такі няскладна абмяркоўвала пытанне аб лёсе Устаноўчага сходу. Раптам паяўляецца ва фракцыі Ленін. Коратка і энергічна ён даказвае неабходнасць пакончыць з контррэвалюцыйным Устаноўчым сходам. Тэхнічны спосаб разгону ён прапануе такі: пасля пасяджэння ўсіх членаў Устаноўчага сходу выпусціць з Таўрычаскага палаца, а на наступны дзень у яго ўпусціць толькі комуністаў і левых эсэраў. Прапанова была прынята і ажыццёўлена.

Потым памятаецца сустрэча на 3-м з'ездзе Советаў, яшчэ іншыя шматлікія сустрэчы, гутаркі і субяседванні на працягу 18, 19, 20 і 21 гг. Але іх усіх не пералічыш. Спынюся на самых галоўных сустрэчах, якія асабліва ярка адбіліся ў памяці.

Вось сакавік месяц 1918 года. Партыя прыступіла да арганізацыі Чырвонай Арміі. Стары фронт разбуран. Небяспека германскага імперыялізма, падобна смерці, ахапіла ўсю нашу Совецкую краіну. Ідуць у радах партыі спрэчкі адносна метаду арганізацыі Чырвонай Арміі. Баявое пытанне — прыцягненне ваенных спецыялістаў і кадравых афіцэраў. Большая частка тагачасных ваенных работнікаў супроць гэтага прыцягнення. Гэтыя работнікі апеліруюць да таварыша Леніна, які толькі што разам з усім урадам і Цэнтральным Камітэтам партыі пераехаў з Піцера ў Маскву. Збіраюцца ў Крэмлі, тады яшчэ няўтульным, пустым і не ахоўваўшымся. У адным з пакойчыкаў самага верхняга паверха каля 40—50 ваенных работнікаў пад старшынствам таварыша Леніна адкрываюць сваю

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы